# ДЗЕНЬ КАНСТЫТУЦЫІ СЯГОННЯ,

# ВЯЛІКІ ДЗЕНЬ, ШЧАСЛІВЫ ДЗЕНЬ!

* *

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ
і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 36 (467) | Аўторак, 5 снежня 1961 г. | Цана 1 кап.

# Вялікія правы і абавязкі
## НАМ КАНСТЫТУЦЫЯ САВЕЦКАЯ ДАЛА

★ ★

## НАША СОНЦА

*Светлае, радаснае свята адзначае сёння савецкі народ — Дзень сваей Канстытуцыі. Вялікія прсвы і абавязкі дала яна ўсім людзям, прынесла шчаслівае жыццё ў кожны дом.*

*Нам, маладым, здаецца, што ўсе так і павінна быць. Кожны чалавек мае права на працу, вучобу, адпачынак. Але тое, што мы атрымліваем сёння як законнае і натуральнае права грамадзяніна, раней было прывілегіяй багатых. За гэтыя правы змагаліся нашы бацькі.*

*Сёлета я паступіў у Беларускі дзяржаўны універсітэт імя Уладзіміра Ільіча Леніна. Я карыстаюся вялікім правам, якое дала мне Канстытуцыя савецкай дзяржавы, — правам на вучобу. І я не адзін. Такіх тысячы, мільёны ў нашай краіне. Людзям, што будуюць светлы будынак камунізма, што нараджаюцца, каб «сказку сделать былью», патрэбны веды, патрэбна вялікае права вучыцца.*

*І гэта дала нам Савецкая Канстытуцыя — асноўны закон самай шчаслівай у свеце, ясназорнай краіны.*

**Якаў Макарэвіч,
студэнт І курса
філфака.**

## ВУЧЫСЯ, ПРАЦУЙ, АДПАЧЫВАЙ!

Права вучыцца! Колькі радасці прыносіць яно людзям, асабліва моладзі. І кожны з нас імкнецца паўней выкарыстаць гэтае права, атрымаць як мага больш ведаў.

Я займаюся на матэматычным факультэце. Вядома, працаваць прыходзіцца шмат і ўпарта. Але ж тым радасней вынікі, чым цяжэй іх дасягнуць.

Ва універсітэце студэнты выкарыстоўваюць і права на адпачынак. Мы рыхтуемся жыць пры камунізме і павінны быць усебакова развітымі людзьмі. Я, напрыклад, з радасцю наведваю рэпетыцыі аркестра народных інструментаў. Тут шмат нас, маладых. У мастацтве мы знаходзім не толькі эстэтычную асалоду; яно ўзвышае чалавека, будзіць пачуцці і думкі.

Вялікія правы і абавязкі дала маладым Савецкая Канстытуцыя. Яе яркае святло саграваае нас на кожным кроку.

**Вера Барзакоўская,
студэнтка ІІ курса матфака.**

★ ★

## ЗАКОН ШЧАСЦЯ і РАДАСЦІ

Аб тым, што людзі некалі не мелі магчымасці вучыцца, жылі ў галечы і цемры, не мелі нават самых простых чалавечых свабод, нам толькі расказвалі, або мы чыталі ў кнігах.

Гэтае далёкае мінулае бачылі нашы дзяды, а мо і бацькі.

А што я магу сказаць аб сабе? Калі я скончыла дзесяць класаў, мне прадставілася магчымасць вучыцца далей. Мяне яшчэ ў школе цікавіла захапляючая навука аб прыродзе, і таму я пасля заканчэння дзесяцігодкі паступіла вучыцца на біялагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Ці магло быць такое раней? Я думаю, што не, бо ў грамадстве, дзе няроўна і несправядліва падзелены чалавечыя багацці, аб роўным і свабодным праве на вучобу не магло быць і размовы.

Ва універсітэце ж мы маем усё неабходнае для паспяховага авалодвання ведамі. Мы яшчэ мала ведаем жыццё, але тое, што мы атрымаем за час вучобы, мы хутка панясём народу, мы будзем будаваць у нашай краіне самае шчаслівае грамадства на зямлі — камунізм.

Няхай жа хутчэй прыдзе гэты светлы і радасны дзень!

**Нэля Вярэм'ева,
студэнтка V курса біяфака.**

*Гудкі заводаў басам*
*будзяць золак,*
*Алеюць хвалі і звіняць*
*бары.*
*І над усім, адціснутая*
*золатам,*
*Як сонца,*
*Канстытуцыя гарыць!*

## Знаёмства адбылося



*Пасля таго, як нашы кубінскія сябры абсталяваліся на новым месцы жыхарства, у інтэрнаце на вуліцы Бабруйскай, яны пазнаёміліся з горадам і універсітэтам.*

*На другі дзень пасля прыезду пасланцоў Кубы прыняў і меў з імі размову рэктар універсітэта Антон Нікіфаравіч Сеўчанка.*

*Кубінцы пазнаёміліся з выдатнымі мясцінамі Мінска і з універсітэтам. І горад, і універсітэт ім вельмі спадабаліся.*

*У гэтыя дні кубінскіх юнакоў часта можна бачыць сярод студэнтаў.*

*Вось група. Некалькі смуглаватых юнакоў у акружэнні нашых хлопцаў і дзяўчат. Размова пакуль што ідзе на розных мовах — на рускай, іспанскай, французскай, англійскай, але студэнты добра разумеюць адзін аднаго. А іншы раз і пальцы выручаюць.*

*— Як вас завуць? — пытаюцца нашы дзяўчаты ў кубінскіх юнакоў. — Вот із ё нэйм?*

*— Хосе.*

*— Рауль.*

*— А мяне Галя!*

*Студэнты абменьваюцца з кубінцамі памятнымі значкамі, адкрыткамі.*

*Знаёмства адбылося! Дружба завязана! Яна будзе моцнай!*

*НА ЗДЫМКУ: сустрэча на вакзале.*

## Канцэрт для воінаў

Нядаўна ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці філфака выступілі з канцэртам у падшэфнай вайсковай часці.

Воіны цёпла сустрэлі сваіх шэфаў.

Дружнымі апладысментамі суправаджаліся выступленні кожнага з выканаўцаў. Не было, бадай, ніводнага нумара праграмы, які б не спадабаўся гледачам. У заключэнне выступіў аркестр народных інструментаў пад кіраўніцтвам Анатоля Дземідзенкі.

Былі выкананы «Реве та й стогне Дніпр широкій», «Полька» Глінкі і іншыя музычныя творы. Вялікім поспехам карысталіся песні «Салдацкая лірычная» і «Студэнцкая песенька», словы і музыку якіх напісаў студэнт-першакурснік Я. Казюкін.

І госці, і гаспадары засталіся задаволенымі сустрэчай.

В. СТЭЛЬМАХ.




Малюнак Міхася Знака.

